ЛЮБАНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ

# Напярэдадні вызвалення: май

**Адным з накірункаў барацьбы партызанскіх фарміраванняў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў вясной 1944 г. напярэдадні вызвалення была барацьба за будучы ўраджай. Перад партызанамі стаяла задача не толькі абараніць мірнае насельніцтва ад угону ў Германію і харчовых рэквізіцый, але і зберагчы пасевы азімых зерневых культур і забяспечыць яравы сеў.**



**Мікалай РОЗАЎ, камандзір п/брыгады №64 імя В.П. Чкалава (справа), ставіць перад камандзірамі атрадаў баявую задачу.**

З мэтай пазбавіць Чырвоную Армію пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі крыніц папаўнення запасаў прадуктаў харчавання і стварыць штучны голад на вызваленых землях камандаванне вермахта ўсімі сіламі імкнулася перашкодзіць выкананню гэтай задачы.

У даняcенні камандзіра партызанскага злучэння Мінскай вобласці Іосіфа Бельскага гаварылася, што гітлераўцы пад пагрозай смерці выганяюць у поле насельніцтва многіх населеных пунктаў Любанскага раёна і прымушаюць іх пераворваць азімыя пасевы. Спецыяльныя паліцэйскія атрады адбіраюць у мірных жыхароў насенны матэрыял. Былі выдадзены загады акупацыйных улад аб забароне правядзення вясенне-палявых работ. У красавіку 1944 г. **Мікалай Розаў**, камандзір партызанскай брыгады №64 імя В.П. Чкалава, паведамляў у штаб пра тое, што акупанты забіваюць сялян, якія былі затрыманы ў полі падчас вясенніх сельскагаспадарчых работ.

**Камандаванне партызанскімі атрадамі ўсімі сіламі дапамагала мірнаму насельніцтву: камісары праводзілі тлумачальную работу пра неабходнасць пашырэння пасяўных плошчаў, камандзіры выдзялялі коней, стваралі нават спецыяльныя пасяўныя брыгады з няўзброеных партызан, а там, дзе гэта было неабходна, прыкрывалі палявыя работы спецыяльна выдзеленымі баявымі групамі.**

Асаблівая ўвага звярталася на вёскі, якія размяшчаліся па граніцы партызанскай зоны і побач з варожымі гарнізонамі. Тут прыходзілася праводзіць вясенне-палявыя работы пад покрывам ночы і пад прыкрыццём узброеных груп народных мсціўцаў. Партызанскія майстры-збройнікі прымалі на рамонт сельскагаспадарчы інвентар і выконвалі гэтыя работы хутка і якасна.

Але, як і ва ўсякай буйной бітве, у барацьбе за хлеб не абышлося без страт. З мэтай акружэння і знішчэння партызанскіх брыгад, а таксама захопу жывёлы і прадуктаў харчавання, вывазу насельніцтва на прымусовыя работы ў Германію 17 мая 1944 г. пачалася карная аперацыя пад кодавай назвай «Марабу». Яна праводзілася ў прыфрантавой паласе 23-га армейскага корпуса 2-й нямецкай арміі групы «Цэнтр» сіламі 810-га і 10-га ахоўных батальёнаў. Яны мелі кодавыя назвы «Феркест-Маніх» і «Люфт-Балон». Супраць партызан было накіравана да 10 тысяч чалавек жывой сілы з узбраеннем да 40 гармат рознага калібру, 20 танкаў, 16 бронемашын. Баявыя дзеянні падтрымлівалі 12 бамбардзіроўшчыкаў і самалётаў-разведчыкаў.

У пачатку блакады партызанскай зоны газета «Кліч Радзімы», орган Любанскага падпольнага райкама КП(б)Б, звярнулася да насельніцтва: «... не давяраць фашыстам, не заставацца ў вёсках, адпраўляцца ў лес, ратаваць дзяцей, жанчын і старых, змагацца з ворагам...». У партызанскіх брыгадах і атрадах распрацоўваліся спецыяльныя мерапрыемствы па абароне мірнага насельніцтва. Камандаванне атрада імя А. Неўскага прыняло пастанову «арганізаваць размяшчэнне сем’яў і ахову іх, для чаго вылучыць людзей, пабудаваць у лесе зямлянкі. Садзейнічаць пошуку тых, хто прапаў без вестак, накіраваць для гэтага групу байцоў атрада».

Наступленне карных атрадаў вялося ў некалькіх накірунках. **Марыя Лапкоўская** з Камуны ўспамінае: «Пад канец мая да нас у вёску зайшлі партызаны. Сказалі, што немцы наступаюць з усіх бакоў, папрасілі гаспадара хаты, дзе мы жылі, быць у іх праваднікам і вывесці з нямецкага кальца. Нас жа папярэдзілі, каб мы сышлі далей у лес. Мы ў першую чаргу вывезлі жорны і прыстроілі іх пад дрэвам – цэлымі зярнятамі харчавацца немагчыма. Потым вывезлі рэчы і адвялі коней і кароў. Гаспадар не вяртаўся суткі, двое, трое, і сыны пайшлі яго шукаць. Іх не было дзён пяць. Вярнуліся змучаныя, счарнелыя. Са слязамі расказалі, што знайшлі цела бацькі, моцна знявечанае, з мноствам ран, выкалатыя вочы, адрэзаныя вушы і нос. Ад расказанага сынамі мы здранцвелі».



**Адам Емяльянавіч СТАШКЕВІЧ (1923 г. н., в. Асавец) – радавы п/атрада «Камсамолец».**



**Антон Пятровіч ДАЙНЕКА (1912 г. н., в. Баянічы) – радавы п/атрада «Баяніцкі».**



**Юлія Іванаўна КАРПОВІЧ, вязень канцлагера Ландсберг.**



**Марыя Мікітаўна ЛАПКОЎСКАЯ падзялілася ўспамінамі пра вайну.**

23 мая ў в. Рачэнь карнікі расстралялі партызанскіх сувязных Міхаіла Курду, Таццяну Курду і іх маці; у в. Жывунь – Усцінню Акуліч і яе дзяцей.

Карная аперацыя працягвалася да 25 мая. Партызанам удалося прарваць блакаду і нанесці праціўніку шэраг удараў. Разам з народнымі мсціўцамі выйшлі з акружэння і мірныя жыхары Любаншчыны. Карнікі спалілі пустыя вёскі: Лісцёнку, Новыя Юрковічы, Песчанец-1, Песчанец-2, Старыя Юрковічы, часткова – Жалы, Забярэзінец, Загалле, Татарку, Старасек, захапілі для ўгону ў Германію 1 128 чалавек. Пасля завяршэння карнай аперацыі баі паміж партызанамі і гітлераўцамі працягваліся і набылі жорсткі характар. Партызанскія атрады за час блакады і ў пачатку чэрвеня панеслі значныя страты – загінулі і прапалі без вестак больш за 50 чалавек, шмат было паранена.

Старшыня СНК БССР, сакратар ЦК КП(б)Б Панцеляймон Панамарэнка ў пачатку чэрвеня звярнуўся да партызан Беларусі з пісьмом аб правядзенні трэцяга этапа «рэйкавай вайны» на камунікацыях праціўніка. 16 чэрвеня Аляксандр Далідовіч, камандзір партызанскай брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі, атрымаў загад штаба партызанскага злучэння аб правядзенні аперацыі па разбурэнні чыгуначнага палатна на ўчастку Пасталы – саўгас «10 год БССР». Для аховы гэтага ўчастка чыгункі нямецкае камандаванне трымала гарнізон у Соснах да 300 чалавек, у Пасталах – да 200 чалавек і ў Серадзібары – да 30 чалавек. Паміж гарнізонамі ўздоўж чыгункі мелася 9 дзотаў на адлегласці 1-1,5 км адзін ад другога. У кожным дзоце налічвалася 10-15 ахоўнікаў.

Улічваючы разведдадзеныя, кожны атрад атрымаў заданне па разбурэнні чыгункі на асобных участках, куды яны павінны былі выйсці 20 чэрвеня да 20.00. Пачатак аперацыі быў назначаны на 24.00. Штаб брыгады размяшчаўся ў раёне цаглянага завода (урочышча Чарга). Пасля выканання задання атрады павінны былі сабрацца на канаве за тры кіламетры ад в. Завыхад.

**Партызаны разумелі, што, магчыма, гэта іх апошняя буйная баявая аперацыя ў тыле ворага, так як з дня на дзень чакалася наступленне Чырвонай Арміі, што гэта іх важкі ўклад у агульную справу знішчэння ворага і вызвалення роднай зямлі.**

Таму да пастаўленай задачы аднесліся з вялікай адказнасцю. Кожны з байцоў імкнуўся прыняць непасрэдны ўдзел у аперацыі.

Першымі да чыгункі падышлі групы блакіроўкі. Яны знішчылі нямецкія патрулі, якія хадзілі ад дзота да дзота і кожныя 5-10 хвілін пускалі ракеты. Партызаны адначасова напалі на дзоты і на працягу пяці хвілін авалодалі ўчасткам чыгункі. Затым пачалася работа груп падрыўнікоў, якія закладвалі шашкі і падпальвалі шнуры. Амаль дзве гадзіны над чыгункай стаяла бесперарыўная кананада выбухаў. Пасля адыходу асноўных сіл за дзеяннямі праціўніка на чыгунцы ажыццяўлялі назіранне да 23 чэрвеня групы з атрадаў Рыгора Плышэўскага і Яўгена Качанава.

Баявая задача была выканана. Толькі партызанамі брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі ў гэту ноч было знішчана 987 рэек. Адыход праціўніка на гэтым накірунку стаў немагчымым. Без страт партызаны вярнуліся да месца дыслакацыі сваіх атрадаў.

**Наталія СІНЯК, дырэктар Любанскага музея народнай славы.**